# Кандратаў Мікола



Кандратаў Мікола — беларускі паэт, празаік і перакладчык.

Нарадзіўся 20 мая 1957 года ў в. Замосце Талачынскага раёна.

Скончыў Коханаўскую сярэднюю школу (1974г.), матэматычны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута (1978г.), аддзяленне філасофіі і літаратуры Беларускага Калегіюма (2005г.).

У 1978–1979 гг. па размеркаванні быў накіраваны ў Вілейку, дзе выкладаў матэматыку ў Прафесійна-тэхнічным вучылішчы аўтамабільнага транспарту. Пасля службы ў войску (1979–1980гг.) працуе праграмістам на Мінскім вытворчым аб'яднанні вылічальнай тэхнікі.

У 1997–1999 гг. быў слухачом Авестыйскай астралагічнай школы Паўла Глобы.

У 2003 годзе стаў сябрам суполкі “Літаратурны квартал” (з 2004 года — “Літаратурнае прадмесце”), заснаванай пры газеце “Літаратура і мастацтва”. У паэтычным тэатры “Арт.С” — адзін з арганізатараў задыякальна-паэтычнага праекта “12 сузор'яў” у Літаратурным музеі М. Багдановіча.

З восені 2009 года быў членам Саюза беларускіх пісьменнікаў.

З 1994 года пачаў пісаць вершы на беларускай мове.

Аўтар кніг вершаў “Возера Рудакова” (2002 г., выдавецтва “Беларускі кнігазбор”), “Вершы і зоркі” (2008 г., выдавецтва “Мастацкая літаратура”), “Кроплі дажджу” (2013 г., выдавецтва “Логвінаў”).

З'яўляецца таксама ўкладальнікам і адным з аўтараў кнігі “У святле астралогіі. Лёсы беларускіх літаратараў” (2016 г., выдавецтва “Беларускі кнігазбор”). У кнізе “Нявеста для Базыля” (2017 г., выдавецтва “Мастацкая літаратура”) змешчана яго казка “Чалавек і бабёр”.

Друкаваўся ў зборніках “Літаратурны квартал” (2003г.), “Дзень паэзіі–2005”, часопісах “Паміж”, “Дзеяслоў”, “Маладосць”, “Полымя”, газеце “Літаратура і мастацтва”.

Займаецца перакладамі рускай паэзіі на беларускую мову.

У 2008 годзе выйшла кніга вершаў і перакладаў “Вершы і зоркі”, а ў 2020 годзе — “На Божай далані”. У 2012 годзе ў часопісе “Маладосць” (№ 4. — С. 112–114) быў надрукаваны артыкул М. Кандратава “Шлях праўды Аляксея Карпюка”.

Жыве ў Мінску.

# Інтэрнэт-рэсурсы:


1. **Беларуская інтэрнэт-бібліятэка “Kamunikat”. Мікола Кандратаў**: [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: https://kamunikat.org/Kandratau_Mikola.html. — Дата доступу: 18.02.2022.
2. **Кандратаў Мікола**: [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: http://pridvinie.vlib.by/index.php/mtree-lib/pismenniki-paety-litaratary/kandrata-mikola. — Дата доступу: 18.02.2022.
3. **Мікола Кандратаў**: [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: https://be.wikipedia.org/wiki/Мікола_Кандратаў. — Дата доступу: 18.02.2022.
4. **Паэтычны тэатр “Арт.С”**. Удзельнікі: Мікола Кандратаў: [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: http://art-s.by/udelniki-mikola-kandratau.html. — Дата доступу: 18.02.2022.